ЗАЎТРА — СВЯТА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 17 (1010) | АЎТОРАК, 6 лістапада 2001 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ЗАДАЧЫ ВЫЗНАЧЫЎ ПРЭЗІДЭНТ

Гомельшчына стала першай вобласцю краіны, якую пасля верасНёўскіх прэзідэнцкіх выбараў наведаў кіраўнік нашай дзяржавы. Рабочая паездка А.Р.Лукашэнкі ў горад над Сожам адбылася 23 кастрычніка. Напачатку ён сустрэўся з калектывам акцыянернага таварыства "Гомельбудматэрыялы", дзе азнаёміўся з вытворчасцю і сацыяльнай сферай прадпрыемства, якое ўзяло курс на паступовае зніжэнне кошту выпускаемай прадукцыі, што спрыяе больш таннаму жыллёваму будаўніцтву.

Прэзідэнт рэспублікі агледзеў таксама экспанаты выстаўкі шэрагу прадпрыемстваў абласнога цэнтра, якія займаюцца выпускам будматэрыялаў, пацікавіўся, якімі спосабамі дасягаецца змяншэнне затрат на іх вытворчасць, выказаў на гэта асабістыя меркаванні і паставіў адпаведныя задачы.

У той жа дзень А.Р.Лукашэнка правёў пашыраную нараду з кіруючым актывам Гомельшчыны, на якой разглядалася пытанне сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці ў 2001-2005 гадах. Пасля ўступнага слова кіраўніка краіны з дакладам па азначанай тэме выступіў старшыня Гомельскага аблвыканкама А.С.Якабсон.

Пры абмеркаванні разглядаемага пытання слова было прадстаўлена і рэктару нашага універсітэта, члену Савета Рэспублікі, старшыні Савета рэктараў Гомельшчыны, прафесару М.В.Селькіну.

## ПРАБЛЕМЫ АДУКАЦЫІ І ШЛЯХІ ІХ ВЫРАШЭННЯ

**(з выступлення рэктара ГДУ імя Ф.Скарыны прафесара, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М.В.Селькіна на сустрэчы ў Гомелі з Прэзідэнтам краіны А.Р.Лукашэнкам).**

У передвыбарнай праграме Прэзідэнта Беларусі абазначана, што забяспечыць асноўныя прыярытэты ў развіцці дзяржавы зможа толькі здаровы і адукаваны чалавек. І тут вялікую ролю павінны адыграць рэгіянальныя ВНУ.

Выкладчыцкі склад ВНУ вобласці — гэта 2300 чалавек, з іх — 80 дактароў навук, прафесараў і 785 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Усе мы ведаем, якія праблемы сёння ў вышэйшай школы. Што ж патрэбна зрабіць, каб іх стала менш?

Савет рэктараў Гомельскай вобласці сумесна з аблвыканкамам распрацавалі праграму развіцця вышэйшай адукацыі ў рэгіёне. Яе асноўная мэта — задавальненне патрэб Гомельшчыны ў спецыялістах вышэйшай кваліфікацыі, здольных вытрымаць канкурэнцыю на рынку працы; узмацненне інтэграцыі з дзейнасцю народнагаспадарчага комплексу рэгіёна, яе пераарыентацыя на вырашэнне канкрэтных праблем, падтрымка фундаментальных даследаванняў, паўсядзённая праца па фарміраванню ў моладзі высокіх духоўна-маральных каштоўнасцей, актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

Дадзеная праграма не патрабуе дадатковых бюджэтных фінансавых сродкаў, а толькі вялікай арганізацыйнай працы, прыняцця некаторых нарматыўных дакументаў, актыўнай пазабюджэтнай дзейнасці, выкарыстання ўсемагчымых рэспубліканскіх і мясцовых паступленняў, утварэння папячыцельскіх фондаў, пошуку спонсараў.

Пэўныя пытанні мэтазгодна вырашыць у адукацыйнай палітыцы. Перш за ўсё пара распрацаваць Палажэнне аб ролі рэгіянальных класічных універсітэтаў, на якія (сумесна з Саветам рэктараў і аблвыканкамам) ускласці адказнасць за рэгіянальную адукацыйную палітыку. Тады не будзе дубліравання спецыяльнасцей у рэгіёне, пройдзе сканцэнтраванне навукова-педагагічных сіл для вырашэння канкрэтных праблем, пачнуць рацыянальна выкарыстоўвацца вучэбныя плошчы і інтэрнаты. А гэта ўжо эканомія сродкаў. У прыватнасці, у Гомелі ў дзвюх ВНУ рыхтуюць спецыялістаў па геалагічных спецыяльнасцях.

Патрэбна неадкладна распрацаваць адкрытую методыку абгрунтаванага размеркавання выдзяляемых бюджэтных сродкаў на навуку, капітальны і бягучыя рамонты, абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Тады рэгіянальныя ВНУ не будуць выступаць у ролі просьбітаў і ўсім будзе ўсё зразумелым. У гэтым плане Дэкрэт Прэзідэнта "Аб павышэнні ролі навукі ў рэфармаванні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" нарэшце дазволіць зламаць бар'еры паміж вузаўскай і акадэмічнай навукай і дасць новыя стымулы для эфектыўнага выкарыстання навуковага патэнцыялу.

Як у сярэдняй, так і ў вышэйшай школе варта звярнуць сур'ёзную ўвагу на фундаменталізацыю адукацыі, на вывучэнне дысцыплін прыродазнаўчага, навуковага цыклу, чым заўсёды цанілася наша адукацыя. Я не супраць гуманітарызацыі адукацыі. Але яна павінна быць у разумных межах. Школьныя і вузаўскія вучэбныя планы перагружаны і, як вынік, большасць выпускнікоў маюць адхіленні ў здароўі. Мала часу выдзяляецца для самастойнай падрыхтоўкі. У школах і ВНУ павінен быць дакладна вызначаны ўзровень базавай адукацыі ў рамках дзяржаўнага фінансавання, які дазваляе атрымаць сучасную адукацыю. Усё дадатковае навучанне (профільнае, паглыбленае, дадатковыя веды навучання і г.д.) павінна ажыццяўляцца са згоды бацькоў у парадку аказання платных паслуг. Гэта, натуральна, не тычыцца той падтрымкі адоранай моладзі, якая склалася дзякуючы ініцыятыве Прэзідэнта. Гэтыя пераўтварэнні дазволяць не толькі павысіць матэрыяльны ўзровень педагогаў без дадатковага фінансавання, так як колькасць гадзін зменшыцца, а, значыць, кошт адной гадзіны ўзрасце, але і паспрыяюць паляпшэнню адукацыі ў цэлым.

У большасці краін свету пытанні адукацыі і выхавання знаходзяцца пад жорсткім кантролем дзяржавы. Таму ўсе прыватныя навучальныя ўстановы павінны быць уключаны ў склад дзяржаўных у якасці падраздзяленняў без змянення форм уласнасці на спецыяльна агавораных умовах.

З моладдзю патрэбна працаваць штодзённа, штогадзінна. У пазаўрочны час студэнты абавязаны папрацаваць у вучэбных лабараторыях, камп'ютэрных класах, на навуковых палігонах. Цяпер гэта праблематычна, так як практычна ўсе ВНУ займаюцца ў дзве змены, а асобныя і ў тры. Вельмі хацелася б, каб пад патранажам Прэзідэнта ў кожным рэгіянальным класічным універсітэце пачалося будаўніцтва сучаснага вучэбна-лабараторнага корпуса. Гэта ўвойдзе ў гісторыю!

## П.І.БРЫГАДЗІН – МІНІСТР АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 597 ад 19 кастрычніка 2001 г. Пётр Іванавіч Брыгадзін назначаны Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь.**

П.І.Брыгадзін нарадзіўся ў 1949 годзе ў в.Моладава Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Беларус. У 1971 годзе закончыў Беларускі дзяржуніверсітэт. Па спецыяльнасці — гісторык. Пасля заканчэння універсітэта з 1971-га па 1973 г.г. служыў у войску. Працоўную дзейнасць пачаў загадчыкам кабінета кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў Белдзяржуніверсітэта. З 1975-га па 1977 г.г. вучыўся ў аспірантуры БДУ. З 1977-га па 1981 г.г. — выкладчык кафедры гісторыі КПСС Белдзяржуніверсітэта, сакратар камітэта камсамола універсітэта. У 1981-1982 г.г. — загадчык аддзела прапаганды і культурна-масавай работы ЦК ЛКСМБ, а з 1982-га па 1984 г.г. — намеснік сакратара парткама з правамі райкама КПБ Белдзяржуніверсітэта. З 1984-га па 1988 г.г. — інструктар аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ. З 1988-га па 1996 г.г. — прарэктар па вучэбнай рабоце, загадчык кафедры гісторыі. У 1996-2000 г.г. — першы прарэктар Белдзяржуніверсітэта, рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы. З 2000 года — рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Доктар гістарычных навук, прафесар. Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём "За працоўную доблесць".

## БДУ АДЗНАЧЫЎ ЮБІЛЕЙ

У кастрычніку адбылося шмат мерапрыемстваў, якія прысвячаліся 80-гадоваму юбілею Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Акордным стала ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета, якое прысвячалася гэтай знамянальнай падзеі. Юбілярам было выказана шмат цёплых віншавальных слоў, уручаны прывітальныя адрасы, памятныя падарункі, кветкі.

Ад нашага універсітэта калектыў БДУ і яго ветэранаў павітаў і ўручыў прывітальны адрас рэктар, старшыня Савета рэктараў Гомельшчыны, член Савета Рэспублікі, прафесар М.В.Селькін.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Яго чарговае, кастрычніцкае пасяджэнне па добрай традыцыі набыло ўрачысты пачатак. З 80-гадовым юбілеем цёпла павіншавалі доктара медыцынскіх навук, прафесара кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін А.С.Калугіна. Рэктар прафесар М.В.Селькін уручыў яму Ганаровую грамату Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і дыплом Ганаровага прафесара універсітэта. Старшыня прафкама Г.І.Варатніцкі падараваў юбіляру букет кветак і ўручыў матэрыяльнае ўзнагароджанне. За шматгадовую плённую працу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з юбілейнымі датамі Ганаровыя граматы з рук рэктара і найлепшыя пажаданні атрымалі вядучая лабарантка кафедры хіміі Л.М.Уздоўская і доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры оптыкі У.У.Сыцько.

Кандыдату філалагічных навук І.М.Афанасьеву з кафедры рускай літаратуры ўручаны дыплом дацэнта.

Адбылося таксама ўзнагароджанне чэмпіёнаў універсітэта пераходнымі Кубкамі, а прызёраў спаборніцтваў па валейболу сярод мужчынскіх і жаночых каманд — дыпломамі адпаведных ступеняў.

Член Савета Рэспублікі М.В.Селькін зрабіў паведамленне аб рабоце Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і яго палат.

Аб выніках работы навукова-метадычнага савета універсітэта за мінулы навучальны год і асноўных задачах на бягучы далажыў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф.Каморнікаў.

Аб выніках работы дзяржаўных экзаменацыйных камісій і паказчыках летняй экзаменацыйнай сесіі праінфармавала ўдзельнікаў пасяджэння начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова.

Па двух пералічаных вышэй пытаннях парадку дня прыняты адпаведныя рашэнні.

На конкурснай аснове на займаемыя пасады перавыбраны загадчыкам кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства доктар філалагічных навук У.І.Коваль, дацэнтам кафедры педагогікі — Ф.У.Кадол. На вакантную пасаду старшага выкладчыка кафедры філасофіі абрана Н.Л.Васькаўцова.

На савеце былі разгледжаны і некаторыя іншыя пытанні агульнауніверсітэцкай дзейнасці.

## АБ'ЕКТ ДАСЛЕДАВАННЯ — ЭКАЛОГІЯ

Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны і Гомельскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы акаляючага асяроддзя правялі III Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю "Экалагічныя праблемы Палесся і сумежных тэрыторый".

На пленарным пасяджэнні, якое ўступным словам адкрыў прарэктар па навуковай рабоце ГДУ прафесар Д.Р.Лін, былі заслуханы навуковыя даклады вучонага сакратара Гомельскага вышэйшага інжынерна-каманднага вучылішча МНС І.П.Аніськова, дырэктара Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэміка НАНБ В.А. Іпацьева, загадчыка кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў ГДУ прафесара У.І.Міроненкі, доктара біялагічных навук з Брэсцкага дзяржуніверсітэта імя А.С.Пушкіна У.Е.Гайдука, загадчыка кафедры экалогіі ГДУ дацэнта А.М.Кусянкова, загадчыка лабараторыі Інстытута геалогіі НАНБ кандыдата геолага-мінералагічных навук У.П.Самадурава.

Затым канферэнцыя працягвала работу ў трох секцыях. На іх пасяджэннях заслухана і абмеркавана звыш 60 навуковых паведамленняў па розных накірунках экалагічных даследаванняў.

### ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць кандыдата тэхнічных навук з кафедры матэматычных праблем кіравання* ***СУКАЧ Алену Іванаўну*** *з прысваеннем ёй БелВАКам вучонага звання дацэнт.*

### З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую працоўную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана вядучы лабарант кафедры хіміі* ***УЗДОЎСКАЯ Любоў Міхайлаўна.***

* * *

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны доктар фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі* ***СЕМЯНЧУК Уладзімір Мікалаевіч.***

# ВУЧОНЫ, ЯКОГА ПАМЯТАЮЦЬ І ШАНУЮЦЬ

У навуковым асяроддзі фізікаў нашай краіны і далёка за яе межамі добра вядома імя Барыса Васільевіча Бокуця. Ён – аўтар больш двухсот навуковых прац, у тым ліку трох манаграфій, атрымаў пасведчанні на 20 вынаходніцтваў.

16 гадоў жыцця Барысам Васільевічам было аддадзена Гомельскаму дзяржаўнаму універсітэту імя Ф.Скарыны, дзе на пасадзе рэктара ён праявіў выдатныя здольнасці арганізатара навукі, стварыў шырока зарэкамендаваўшую сябе аптычную школу, стаў заслужаным дзеячом навукі, акадэмікам АН БССР, ардэнаносцам, адным з нямногіх у вышэйшай школе Беларусі лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР.

На жаль, цяжкае раненне ваеннага ліхалецця моцна адбілася на здароўі славутага фізіка і ён заўчасна ўшоў з жыцця.

Сёлета напрыканцы кастрычніка Б.В.Бокуцю споўнілася б 75. У знак гэтай юбілейнай даты і светлай памяці вучонага Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут фізікі імя Б.І.Сцяпанава, Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў правялі на базе ГДУ трохдзённую Міжнародную навуковую канферэнцыю "Праблемы ўзаемадзеяння выпраменьвання з рэчывам". У яе рабоце пажадала прыняць удзел звыш 100 вучоных Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Фінляндыі, Партугаліі, якія прадставілі і даслалі тэзісы сваіх дакладаў для апублікавання.

Работа канферэнцыі пачалася з ускладання кветак да мемарыяльнай дошкі Б.В.Бокуця, прымацаванай да вучэбнага корпуса фізічнага факультэта, які, як падкрэсліў рэктар ГДУ М.В.Селькін, быў пабудаваны дзякуючы намаганням Барыса Васільевіча.

Пленарнае пасяджэнне канферэнцыі адкрыў дэкан фізічнага факультэта дацэнт С.В.Шалупаеў. Ва ўступным слове яе ўдзельнікаў цёпла вітаў рэктар ГДУ прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М.В.Селькін. Ён адзначыў, што на навуковым форуме прысутнічае шмат былых калег і вучняў Б.В.Бокуця, дастойных прадаўжальнікаў яго справы. Апладысментамі было сустрэта паведамленне аб тым, што на канферэнцыі прысутнічаюць дачка і сын Барыса Васільевіча.

Пра жыццёвы і навукова-педагагічны шлях Б.В.Бокуця, яго вялікую ролю ў станаўленні і развіцці Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны ў сваіх выступленнях расказалі М.В.Селькін і былы, а цяпер ганаровы рэктар ГДУ прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Л.А.Шамяткоў.

Аб укладзе Б.В.Бокуця ў развіццё лінейнай і нелінейнай крышталеоптыкі апавядаў прысутным у актавай зале былы вучань Барыса Васільевіча А.М. Сердзюкоў, які стаў доктарам фізіка-матэматычных навук, прафесарам, членам-карэспандэнтам НАНБ, загадчыкам кафедры оптыкі.

Пасля пленарных дакладаў госці азнаёміліся з экспанатамі музея-лабараторыі Ф.Скарыны і лабараторыямі фізічнага факультэта.

На другі дзень канферэнцыя працягвала сваю работу ў секцыях па тых накірунках, у развіццё якіх Б.В.Бокуць унёс важкі ўклад: нелінейнай оптыцы, крышталеоптыцы, фізіцы лазераў, лазернай тэхналогіі, тэорыі электрамагнетызму, акустаоптыцы. Заслуханы і абмеркаваны звыш 30 навуковых дакладаў, якія маюць значнае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Сярод дакладчыкаў былі выдатныя фізікі доктары фізіка-матэматычных навук, прафесары А.Л.Топа (Лісабон), С.А. Траццякоў (Фінляндыя), А.Ф.Канстанцінава (Масква), С.М.Шандараў (Томск), В.М.Белы, А.Г.Хаткевіч (Мінск) і іншыя навукоўцы.

У апошні дзень канферэнцыі з дакладам выступіў член-карэспандэнт НАНБ А.А.Богуш, які расказаў аб супрацоўніцтве ГДУ ў галіне фізікі высокіх энергій і электрамагнітных узаемадзеянняў, яго выніках і перспектывах. У выставачнай зале універсітэта дэманстраваліся стэндавыя даклады яе ўдзельнікаў, якія таксама выклікалі вялікую цікавасць навукоўцаў.

**Б.ВАЛОДЗІН.**





**Гэтыя здымкі былі зроблены ў час наведвання нашага універсітэта намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыні прэзідэнцкага Фонду падтрымкі адоранай моладзі прафесарам М.А. Аўласевічам.**

**1. М.А.Аўласевіч знаёміцца з дзейнасцю студэнцкай лабараторыі "Вандроўнік" філалагічнага факультэта, якая прэтэндуе на атрыманне прэзідэнцкага гранта.**

**2. На паказе сцэнічнага свята "Вяселле" ў выкананні студэнтаў-філолагаў.**

**Фота У.Чысціка.**

# КНІГІ НЕ ВЕДАЮЦЬ МЕЖАЎ

ГДУ імя Ф.Скарыны наведалі прадстаўнікі Польскага Інстытута ў Мінску і Пасольства Рэспублікі Польшча ў нашай краіне з мэтай перадачы ў дар універсітэцкай бібліятэцы выдадзенай у апошнія гады ў Польшчы сучаснай навуковай літаратуры.

Прарэктар па вучэбнай рабоце ГДУ імя Ф.Скарыны прафесар С.Ф.Каморнікаў ад імя рэктарата, выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта падзякаваў дырэктару Польскага Інстытута ў Мінску пану Цэзарыю Карпінскаму за дапамогу ў папаўненні універсітэцкага бібліятэчнага фонду. Разам з тым С.Ф.Каморнікаў адзначыў, што зацікаўленасць польскага боку ў далучэнні прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў універсітэта да больш маштабнага еўрапейскага дыялогу пры дапамозе кнігі яшчэ раз сведчыць пра высокі якасны ўзровень і патэнцыял нашай вузаўскай навукі, пра прызнанне ГДУ імя Ф.Скарыны як аўтарытэтнага навуковага цэнтра.

Загадчык кафедры беларускай літаратуры прафесар І.Ф.Штэйнер падчас сустрэчы выказаў думку аб неабходнасці далейшага развіцця разнастайных формаў супрацоўніцтва. Прынамсі, ён прапанаваў устанавіць сувязі паміж польскімі ВНУ і ГДУ для арганізацыі ўзаемных абменных стажыровак беларускіх і польскіх выкладчыкаў і аспірантаў, што, безумоўна, садзейнічала б павышэнню іх прафесійнай кампетэнтнасці і кваліфікацыі. Прычым карысць ад такіх кантактаў відавочная для абодвух бакоў, бо ў Польшчы ёсць універсітэцкія кафедры, якія спецыялізуюцца на славянскай філалогіі, у тым ліку і ўсходнеславянскай, а студэнты-філолагі ГДУ ў сваю чаргу вывучаюць польскую мову і літаратуру. Як заўважыла загадчыца кафедры беларускай мовы прафесар А.А.Станкевіч, "нам ёсць чаму павучыцца ў вас, а вам – у нас". Не выпадкова рух навуковай думкі наперад мае на ўвазе як вывучэнне і асэнсаванне свайго вопыту, так і спасціжэнне дасягненняў іншых.

У заключэнне С.Ф.Каморнікаў выказаў упэўненасць, што атрыманыя кнігі (а іх каля паловы тысячы, прычым не толькі на польскай, але і на іншых еўрапейскіх мовах), якія асвятляюць актуальныя праблемы філасофіі, культуралогіі, гісторыі, літаратуразнаўства, мовазнаўства, псіхалогіі, дапамогуць выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам універсітэта актывізаваць сваю навуковую дзейнасць у рэчышчы сучаснага агульнаеўрапейскага інтэлектуальнага кантэксту.

**С.ХАНЕНЯ,**
**намеснік дэкана філфака па выхаваўчай рабоце.**

# ПОЧЕТНАЯ СТИПЕДИЯ ВЕРОНИКИ БРИЛЕВОЙ

Нынче наука и образование стараются не отставать от стремительного темпа изменений в жизни. В вузах вводятся новые предметы, посвященные изучению норм международного права, наука поднимает актуальные на сегодняшний день вопросы и проблемы, которые волнуют весь мир. В этот процесс поиска включаются не только заслуженные юристы, социологи, экономисты и политики. Немалый интерес решение подобных проблем вызывает и у будущих специалистов, студентов различных учебных заведений, а также аспирантов.

В мае-июле 2001 года Международное общественное объединение по изучению ООН и информационно-образовательным программам и Управление Верховного комиссара ООН по делам беженцев в рамках совместного проекта провели конкурс стипендий для белорусских студентов и аспирантов по проблемам вынужденной миграции, беженцев и нерегулируемых перемещений населения, посвященный 50-летию принятия конвенции ООН о статусе беженцев. К участию в конкурсе были приглашены студенты 1-4 курсов и аспиранты 1-2 года обучения высших учебных заведений Республики Беларусь.

Наряду с Владимиром Рудько – курсантом следственно-экспертного факультэта Академии МВД РБ первое место в этом конкурсе заняла студентка тогда еще 4-го, а теперь 5-го курса юридического факультета ГГУ Вероника Брилева. Она предоставила две работы: "Беженцы и права человека" и "Беженцы в Республике Беларусь". Нет сомнений в том, что обе работы выполнены на достаточно высоком уровне – на подобных мероприятиях беспристрастное жюри. Согласно условиям конкурса его победители, и Вероника Брилева в том числе, получают стипендию, эквивалентную 200 долларам США, с сентября по ноябрь 2001 года.

**А.ЛУКЬЯНОВА,**
**пресс-секретарь юридического факультета.**

В борьбе за звание чемпионов мира

# ВЫСОКИЙ КЛАСС ЮНЫХ ПРОГРАММИСТОВ

Командный чемпионат мира по программированию среди студентов проводится с 1977 года. Схема его организации включает три этапа: четвертьфинал, полуфинал и финал. Команды-победительницы региональных групп выходят в финал и разыгрывают звание чемпиона мира, Европы, Северной Америки и других континентов. В общей сложности за один сезон в чемпионате участвует более тысячи команд из нескольких сотен высших учебных заведений мира.

На первый взгляд кажется, что эти соревнования относятся к области "высокого чистого искусства", имеющего мало точек соприкосновения с реальной жизнью. Однако результаты этих интеллектуальных игр мировой программистской элиты представляют интерес уже для гораздо более широких кругов, поскольку процесс формирования и подготовки команд опирается на всю образовательную, научную, промышленную и культурную инфраструктуру данной страны.

Не случайно генеральный спонсор чемпионата мира 1992-1997 годов – знаменитая компьютерная корпорация Microsoft вложила в организацию соревнований более двадцати семи миллионов долларов.

Начиная с сезона 1997/98 г.г. генеральным спонсором чемпионата является всемирно известная корпорация IBM.

В сезонах1996/97 и 1997/98 г.г. белорусские команды (БГУ, ГГУ им. Ф.Скорины и БелГУТа) успешно выступали в полуфиналах Северо-Восточного региона (Санкт-Петербург). По этой причине с 1998 года Беларусь получила право проводить четвертьфинал Западного подрегиона, в котором участвуют команды вузов Беларуси и Прибалтики за исключением Латвии.



В IV соревнованиях Западного подрегиона, которые состоялись 17 октября 2001 года в г.Минске, приняли участие 30 команд из ведущих вузов Беларуси (Минск, Гомель, Витебск, Могилев, Гродно, Брест), Литвы (Вильнюс, Каунас) и Эстонии (Таллинн, Тарту).

Командам было предложено для решения 8 задач на 5 часов.

Уже через два часа после начала стало ясно, что основная борьба за победу развернется между командами БГУ (их было 6!!!) и первой командой ГГУ им. Ф.Скорины. Настоящим лидером команды ГГУ-1 стал первокурсник математического факультета Михаил Сваричевский. Нужно отметить, что он – двукратный призер международных олимпиад для школьников по информатике (2000, Китай и 2001, Финляндия), а также победитель Республиканского конкурса научно-исследовательских работ школьников 2001 года и участник международного конкурса Intel ISEF научно-исследовательских работ школьников, который состоялся летом 2001 года в США.

Вместе с ним борьбу за победу вели его однокурсник Виталий Легчилкин и студенты второго курса Вадим Копиченко и Максим Аксютик. Команду ГГУ-2 на соревнованиях представляли первокурсники Иван Зайцев, Павел Сухорученко, второкурсник Сергей Горбачев и студент 4-го курса Дмитрий Аужин.

Интересно также, что в командах БГУ, с которыми и развернулась основная борьба, также много гомельчан: **Сергей Логвиненко** – серебряный призер международной олимпиады по информатике для школьников 1998 года; **Евгений Гончар** – участник международной олимпиады по информатике 2001 года, абсолютный победитель Белорусской республиканской олимпиады по информатике 2000 года; **Алексей Данченко** – серебряный призер международных олимпиад по информатике 1999 и 2000 годов; **Александр Баранов** и **Андрей Коранчук** – победители Белорусской республиканской олимпиады по информатике 2000 года.

В итоге 4 команды: ГГУ-1, БГУ-1, БГУ-3 и БГУ-5 решили по 4 задачи из предложенных 8, и распределение мест между ними определилось штрафным временем, которое чуть лучше оказалось у команды БГУ-5. Второе место по этому показателю заняла команда ГГУ-1.

Первая и вторая команды ГГУ награждены соответственно Дипломами второй и третьей степени четвертьфинала студенческого командного чемпионата мира по программированию.

Всего 7 команд завоевали право участвовать в полуфинале: ГГУ-1, БелГУТ, БГУИР, 2 команды университета Тарту и 2 команды БГУ.

Хочется отметить, что у команды ГГУ-1, которую тренирует третьекурсник математического факультета Константин Судиловский, хорошие перспективы успешно выступить в полуфинале. Подготовка уже начата. Цель – побороться за выход в финал студенческого командного первенства мира по программированию, которое состоится в марте 2002 года на Гавайских островах (США).

**М.ДОЛИНСКИЙ,**
**доцент кафедры математических проблем управления, руководитель команд ГГУ.**

# АБМЕРКАВАНА НА НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫМ САВЕЦЕ

Першым на парадку дня чаргового пасяджэння навукова-метадычнага савета універсітэта стаяла пытанне аб стане метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу на гістарычным факультэце. Аб выніках праведзенай праверкі далажыў член НМС, дацэнт У.М.Старчанка.

Аб эфектыўнасці выкарыстання аўдыторнага фонду паведаміла начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова. На сённяшні дзень ва універсітэце налічваецца 210 акадэмічных груп. На іх прыходзіцца 94 аўдыторыі – 32 на 50 і 100 месцаў, астатнія – толькі на адну групу. Гэта крайне недастаткова. Таму пастаўлена задача выкарыстоўваць кожную аўдыторыю з максімальнай эфектыўнасцю.

Па першых двух пытаннях, разгледжаных на пасяджэнні НМС, прыняты адпаведныя рашэнні.

Аб выніках прыёму студэнтаў на першы курс бягучага навучальнага года далажыў савету прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф.Каморнікаў.

Канферэнцыі



# ПРЫСВЕЧАНА СПАДЧЫНЕ ВЫДАТНАГА ПСІХОЛАГА

У пэўным сэнсе слова Гомель з'яўляецца калыскай культурна-гістарычнай тэорыі ў псіхалогіі, канцэпцыі псіхалагічнага развіцця чалавека, распрацаванай у 20-30-ыя гады мінулага стагоддзя Л.С.Выгоцкім – вучоным, які набыў сусветнае прызнанне ў псіхалагічнай навуцы. Менавіта тут былі задуманы асноўныя ідэі гэтай канцэпцыі, іменна ў гомельскі перыяд жыцця ім былі пачаты эксперыментальныя даследаванні ў дадзеным напрамку, напісаны першыя радкі яго геніяльных псіхалагічных прац.

У апошнія гады наш горад быў абраны своеасаблівым сімвалам-месцам, дзе праводзяцца юбілейныя ўрачыстасці, прысвечаныя рэгулярнаму падвядзенню вынікаў вывучэння багатай тэарэтычнай спадчыны Л.С.Выгоцкага і рэалізацыі яго ідэй у сучаснай навуцы і псіхолага-педагагічнай практыцы.

Упершыню на радзіме знакамітага вучонага адкрыўся псіхалагічны факультэт у Гомельскім дзяржуніверсітэце імя Ф.Скарыны, супрацоўнікі і студэнты якога лічаць сябе паслядоўнікамі тэорыі Л.С.Выгоцкага. Гісторыка-псіхалагічныя даследаванні маладых вучоных сведчаць, што сацыяльна-культурнае асяроддзе Гомеля пачатку мінулага стагоддзя з'явілася важным фактарам узнікнення культурна-гістарычнай тэорыі. Шукае свайго пацвярджэння гіпотэза аб тым, што першая эксперыментальна-псіхалагічная лабараторыя ў Беларусі была адкрыта Л.С.Выгоцкім іменна ў Гомелі. Выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта псіхалогіі ГДУ падтрымліваюць навуковыя сувязі з рознымі навукова-даследчымі цэнтрамі блізкага і далёкага замежжа, якія займаюцца развіццём культурна-гістарычнай псіхалогіі. Па гэтай тэме імі ўжо апублікаваны шэраг навуковых прац.



Да 100-гадовага юбілею з дня нараджэння выдатнага земляка ў 1996 годзе ГДУ правёў сваю частку Міжнароднага псіхалагічнага кангрэса, які прайшоў паэтапна спачатку ў Маскве, затым у Мінску і напрыканцы ў Гомелі. Правядзенне чарговага навуковага мерапрыемства па задуме ініцыятараў арганізацыі канферэнцыі – калектыву кафедры псіхалогіі, узначальваемай дацэнтам А.А.Лытко, – павінна было стаць фактарам прыцягнення ўвагі міжнароднай псіхалагічнай грамадскасці да невычарпальнай тэарэтычнай крыніцы культурна-гістарычнай тэорыі і актывізацыі навукова-даследчай работы ў рамках метадалогіі Л.С.Выгоцкага. Міжнародная навуковая канферэнцыя "Л.С.Выгоцкі і сучасная культурна-гістарычная псіхалогія" праходзіла ў Гомелі на працягу двух дзён. Заяўкі на ўдзел у ёй падалі псіхолагі, як кажуць, ад Рыма да Казані. Масква, Кіеў, Рыга, Іерусалім – вось некаторыя гарады, адкуль прыйшлі матэрыялы на міжнародны псіхалагічны форум, прымеркаваны да 105-годдзя з дня нараджэння Л.С.Выгоцкага. Як і належыць, у канферэнцыі ўдзельнічалі псіхолагі, якія працуюць у ВНУ Мінска, Віцебска, Брэста, Гродна, Полацка і іншых гарадоў Беларусі.

На канферэнцыі прысутнічалі ганаровыя госці – дачка Л.С.Выгоцкага кандыдат псіхалагічных навук Г.Л.Выгоцкая, унучка вучонага – дырэктар Інстытута псіхалогіі Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага універсітэта доктар псіхалагічных навук К.Я.Краўцова, праўнук – выпускнік факультэта псіхалогіі гэтага ж універсітэта Л.Краўцоў.



Пленарнае пасяджэнне прывітальным словам адкрыў старшыня аргкамітэта канферэнцыі прарэктар ГДУ па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін. Аб гомельскім перыядзе навуковай дзейнасці Л.С.Выгоцкага апавядала Г.Л.Выгоцкая. Затым выступілі шырока вядомыя вучоныя па даследаванню тэорыі культурна-асветніцкай псіхалогіі: загадчык кафедры агульнай і дзіцячай псіхалогіі Белдзяржпедуніверсітэта імя М.Танка доктар псіхалагічных навук, прафесар Я.Л.Каламінскі, загадчык кафедры псіхалогіі БДУ доктар псіхалагічных навук, прафесар І.А.Фурманаў, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры псіхалогіі ГДУ М.І.Мурачкоўскі, вядучы інспектар Міністэрства адукацыі Беларусі кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт А.М.Сізанаў і інш.

У другой палавіне канферэнцыі адбыліся секцыйныя пасяджэнні, на якіх абмяркоўваліся актуальныя праблемы тэорыі і практыкі культурна-гістарычнай псіхалогіі. Дыскусіі праходзілі пад кіраўніцтвам прафесараў Я.А.Панько, Л.А.Кандыбовіча, Л.А.Пергаменшчык, Я.Л.Каламінскага, І.А.Фурманава. На наступны дзень работы канферэнцыі яе ўдзельнікі сабраліся за "круглым сталом" і абмеркавалі перспектывы, стандарты, праграмы і падручнікі, па якіх павінна весціся падрыхтоўка псіхолагаў у ВНУ Рэспублікі Беларусь.

На канферэнцыі прынята рашэнне, галоўным пунктам якога стала прапанова стварыць пастаяннадзеючы пры кафедры псіхалогіі ГДУ рэспубліканскі метадалагічны семінар "Л.С.Выгоцкі і сучасная культурна-гістарычная псіхалогія".

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**На здымках: прафесар Л.А.Кандыбовіч і к.п.н. Г.Л.Выгоцкая; з дакладам выступае прафесар Я.Л.Каламінскі. Фота У.Чысціка.**

# ОРИЕНТИР – НА УСОВЕРШЕНСТВОВАНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

На факультете психологии и довузовской подготовки состоялась II областная научно-методическая конференция "Проблемы преподавания общеобразовательных дисциплин в школе и на факультете довузовской подготовки". Впервые эта научная тема была заявлена в минувшем году, но сразу же была одобрительно воспринята как самими участниками первого областного форума, так и теми, кто о ней узнал post faktum. Действительно, высшей школе необходимо взаимодействовать с ПТУ, лицеями, гимназиями и общеобразовательными школами, поскольку все мы делаем одну общую работу: формируем интеллект нации завтрашнего дня. Учебным заведениям разных уровней очень важно не уподобиться Лебедю, Раку и Щуке, а идти в одной упряжке, оказывая всяческую помощь и дополняя друг друга в вопросах обучения. Об этом написал и ректор ГГУ имени Ф.Скорины профессор М.В.Селькин в своей приветственной телеграмме, адресованной участникам конференции, на которой "собрались не только школьные учителя-практики, но и преподаватели-ученые, которые формируют интеллектуальный потенциал региона, менталитет нации. От нашей совместной педагогической деятельности, – отметил Михаил Васильевич, – сегодня зависит будущее белорусского народа. Поэтому школа и ВУЗ должны держать постоянную взаимную связь, нить которой, благодаря подобным формам, деловым и личным контактам, должна неизменно крепнуть, а взаимодействие представителей среднего и высшего звеньев системы образования должно стать постоянным".

Открыл работу конференции проректор университета по учебной работе доктор физико-математических наук, профессор С.Ф.Каморников. В своем докладе на пленарном заседании он остановился на проблемах, с которыми ежегодно сталкиваются преподаватели вуза в период вступительных экзаменов: об уровне подготовки выпускников школ к учебе в вузе, о медалистах истинных и не очень, о конкурсной ситуации. Также был сделан сравнительный анализ результатов приемных кампаний нынешнего и прошлого годов по количеству заявлений, конкурсным особенностям, зачислению на первый курс обучения в ГГУ по разным уровням приоритетов. Особое внимание было уделено тестированию как одной из форм оценки знаний абитуриентов, поскольку эта форма совмещения выпускных и вступительных экзаменов – технология недалекого будущего.



Перед участниками конференции с содержательным докладом выступила заместитель начальника управления образования Гомельского облисполкома Л.И.Котегова.

Заведующая кафедрой довузовской подготовки и профориентации, инициатор конференции доктор технических наук И.М.Елисеева представила исчерпывающую информацию об основных направлениях деятельности кафедры довузовской подготовки и профориентации, остановившись, в частности, на том, что при кафедре работает научно-методический семинар, посвященный актуальным вопросам базового и довузовского обучения, современным технологиям преподавания общеобразовательных дисциплин. К участию в семинаре привлекаются как председатели предметных комиссий, так и ведущие учителя лицеев и школ. Предметом особого внимания для участников семинаров прошлого года стала разработка критериев оценки знаний абитуриентов на вступительных экзаменах. И.М.Елисеева посвятила коллег и в перспективный план научно-методической деятельности кафедры, сказав, что в ближайшее время будет "создан по каждой дисциплине учебно-методический комплект, в который войдут разработанные на кафедральных семинарах программы, критерии оценок, тесты, контрольные задания, методические пособия и другие материалы для абитуриентов и учителей".

На решение важнейших и неотложных проблем образования была направлена работа всех четырех секций конференции, в которых приняли участие не только ученые нашего университета, но и преподаватели БелГУТа, ПТУ-34, учителя городских лицеев и школ. И, что особенно радует, на конференцию приехали "простые сельские учителя" (так скромно они себя отрекомендовали) Гомельской области. Им и был отдан приоритет на заседаниях секций, где они искренне, бесхитростно делились своими методическими наработками, демонстрируя недюжинный запас знаний, форм и методов преподавания любимого предмета.

Подводя итоги конференции, оргкомитет отметил, что работа форума была плодотворной. Участники конференции активно обсуждали вопросы дальнейшего совершенствования довузовской подготовки учащихся школ. Так, на секции "Проблемы и перспективы преподавания физико-математических дисциплин" были внесены следующие предложения:

– создать совместную группу по обсуждению вопросов взаимосвязи учителей школ и преподавателей вузов;

– наладить сотрудничество по проведению отдельных спецкурсов, например, "Роль задач в развитии математических способностей учащихся" и др.

Были высказаны и предложения космического масштаба:

– поставить вопрос перед Министерством образования о создании в Гомеле обсерватории или планетария с соответствующей учебной базой;

– создать кафедру частных методик.

Все участники конференции были едины в главном своем пожелании: сделать этот наставнический форум не только постоянным, ежегодным, но и придать ему статус республиканского со следующего года, а в перспективе – международного.

**Т.АВДОНИНА, доцент кафедры довузовской подготовки и профориентации.**



# "В ЖИЗНИ У КАЖДОГО – СКАЗКА СВОЯ"

***Именно такая творческая тема была предложена участникам нынешнего общеуниверситетского конкурса "А ну-ка, первокурсник!".***

Первый конкурсный день 27 октября торжественно открыл парад волнующихся, радостных, взъерошенных первокурсников. Все было, как полагается: шарики, конфеты, цветочки и пакетики. Затем ведущие назвали организаторов конкурса: студенческий клуб "Молодость", клуб "Адреналин", профком студентов, оргкомитет университета.

Первую сказку представляли студенты-филологи. В этом году они решили сходу показать зрителям все то лучшее, чем гордится факультет невест: своих девушек. Зажигательный танец "невест" порадовал всех от души. Вечной темой для студентов-словесников является и фольклорная практика, проходящая под кодовым призывом: "Именем Кузьмича, откройте!". Все бы хорошо, да вот "бабка Агрипина в очередной раз отказалась вступать в "фольклорную связь" со студентами. "Да, мир не прост, – поделились печалью филологи, – но в сказку все-таки верить стоит".

Чем не сказка – студенческая жизнь? Это и доказывали на сцене студенты физического факультета. Музами физиков явно были Д.Денисов и С.Кобрусев. Сами они на сцене не присутствовали, но их голоса "за кадром" сыграли свою роль. Что ж, физики – это физики: сцены из учебной и вольной жизни студентов, да еще со спецэффектами были встречены на "ура". Будем надеяться, что и в дальнейшем первокурсники продолжат славные дела "отцов".

Настоящий костюмированный бал устроили студенты-математики. Тут были и король, и принцесса, и придворные – все, как в настоящих сказках. На примере нелегкой судьбы принцессы Марьи математики продолжили вечную тему одиночества красивых и умных девушек. Но все закончилось благополучно: суженый не заставил себя долго ждать. Как в сказке.

Для факультета иностранных языков танцы давно стали визитной карточкой. Но и в их сказке героиней была царевна Неплаковна, одинокая хохотунья. Поскольку "идиотский женский смех рождает у мужчины иллюзию", Неплаковне пришлось повременить с устройством личной жизни. Хотя вокруг столько достойных кандидатов: и "мальчик на шаре", и дрессировщик кровожадных хищников Барсика и Пушка. Но надо ждать и верить – и сказка обязательно придет.

А вот студенты факультета физического воспитания были убеждены, что они "рождены сказку сделать былью". И доказали это. Я от души восхищалась ребятами. Молодцы: переделали в стихах (!) "Ромео и Джульетту" Шекспира (есть там и у них великие поэты) и сыграли отлично.

Студенты экономического факультета буквально ворвались на сцену с шарами, конфетти и под мелодию "Августина" из репертуара В.Леонтьева начали свое представление. Отрывки из студенческой жизни, шутки, миниатюры – все это чередовалось с яркими зажигательными танцами. Такую веселую сказку подарили они зрителям.

"Наша жизнь – одна большая сказка", – утверждают студенты юридического факультета. Сказка начинается с рождения... "От роддома до рассвета" был показан путь милиционера Петренко, загадочного хореографа и капитана, укушенного акулой (куда, он так и не признался) – и все в сопровождении песен и танцев.

А вот парнишка Вова с геолого-географического факультета так и не нашел своего призвания в жизни. Во сне он встречает героев сказок: Снегурочку – интимную фигурочку, Робина Гуда, монаха, леди Марианну и др. Чтобы вечно иметь сказочное настроение, нужно стать сказочником, – советует всем Вова.

Обиженным судьбой оказался и "грузчик" с исторического факультета. "Добры молодцы" предлагают ему поменять профессию. Особенно удачно у историков получились пародии на Э.Радзинского, Р.Дубовицкую, Н.Дроздова. Да и "пионеры" не подкачали. Каждый человек – творец своей сказки – такой вывод историков.

Студенты-биологи сосредоточились исключительно на микро- (и т.д.) биологических процессах. Что ж, настоящие патриоты биофака. Чем им удалось завести зал, так это песней "Яйца" группы "Дискотека Авария".

После окончания конкурсных выступлений первокурсников и зрителей приветствовали СТЭМ, сборная команда КВН г.Гомеля, Лелик Кастрюлькин. Жюри в это время подводило итоги.

И вот торжественный, волнующий момент настал. Члены жюри поблагодарили участников за выступления, высказали некоторые критические замечания. Почетная и в чем-то опасная роль вручения дипломов досталась художественному руководителю студенческого клуба М.Ширинкиной. Она сразу сделала приятные объявления: спонсор конкурса клуб "Адреналин" пригласил всех участников конкурса "А ну-ка, первокурсник!" к себе на бесплатную ночную дискотеку, а клубные карты на весь год достались студентам М.Чугаю (физический факультет) и С.Чевеньковой (факультет физической культуры).

За интересную идею программы студенты-физики получили почетный пакет конфет. Подносом с фруктами порадовали организаторы конкурса студентов геолого-географического факультета. Вкусные конфеты получили в подарок танцоры экономического, юридического и физического (за миниатюру "Матрица") факультетов.

Были названы и лауреаты конкурса: Н.Ежова, С.Чевенькова, П.Свердлов (факультет физической культуры), Т.Домошенко, Н.Чугай (физический факультет), А.Чистый, Б.Скригаловский (юридический факультет), Е.Озема (филологический факультет), П.Николаенко, Д.Шевчук (матфак), Ю.Калмыков (экономический факультет), Ю.Нефедова, М.Козловская, Т.Улинченко (биофак), О.Самусева, А.Сахаров (факультет иностранных языков), С.Сиротина (геолого-географический факультет), М.Смирнова, А.Грахоцкий (исторический факультет). С ними мы еще встретимся на гала-концерте, где и будут показаны лучшие творческие номера прошедшего конкурса.

А места в этом году распределились следующим образом: **пальму первенства** уверенно взяли **будущие экономисты**. **Второе** и **третье** призовые места заняли **физический факультет и факультет иностранных языков** соответственно. На **четвертом** месте **математический факультет**, **пятом – факультет физической культуры**, **шестом – юридический**, **седьмом – биологический**, **восьмом – исторический**, **девятом – филологический** факультеты. А **замыкающими в десятке** стали будущие **геологи и географы**.

Кто-то огорчился таким распределением мест, кто-то порадовался за своих. Обиды забудутся, а в памяти останутся только добрые воспоминания о днях "Первокурсника", сказочных днях.

**Татьяна ЦЕЛЕХОВИЧ,**
**студентка гр. РБ-43**
**филологического факультета.**

# МІХАЛУСЁЎ Уладзімір Іванавіч



28 кастрычніка раптоўна памёр загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды біялагічнага факультэта кандыдат ветэрынарных навук, дацэнт Міхалусёў Уладзімір Іванавіч.

У.І.Міхалусёў нарадзіўся ў 1949 годзе ў в.Селішча Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці. У 1972 г. закончыў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны. На працягу 15 гадоў працаваў ва Ўсесаюзным навукова-даследчым ящчурным інстытуце (г.Уладзімір, Расія), дзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1988 г. быў пераведзены на працу ў НДІ радыялогіі (г.Гомель), дзе працаваў на пасадах спачатку старшага, затым вядучага навуковага супрацоўніка, в.а. загадчыка лабараторыі.

З верасня 1999 г. У.І.Міхалусёў працуе на біялагічным факультэце дацэнтам кафедры заалогіі і аховы прыроды, яе загадчыкам.

За кароткі час навукова-педагагічнай дзейнасці ў ГДУ У.І.Міхалусёў зарэкамендаваў сябе высокакваліфікаваным лектарам і навуковым даследчыкам. Яго пяру належыць 92 навуковыя працы. Уладзімір Іванавіч вызначаўся сваёй чуласцю, сціпласцю і добразычлівасцю, хутка заваяваў павагу і аўтарытэт сваіх калег і студэнтаў. Светлая памяць аб ім надоўга захаваецца ў сэрцах тых, з кім ён працаваў побач, каму ён перадаваў свае веды і вопыт.

**Калектыў выкладчыкаў,**
**супрацоўнікаў**
**і студэнтаў біялагічнага**
**факультэта.**

СПОРТ СПОРТ СПОРТ

# ВЕТЭРАН НЕ ЗДАЕ ПАЗІЦЫІ



У Грэцыі адбыўся чарговы чэмпіянат свету па цяжкай атлетыцы сярод ветэранаў. У ім прыняло ўдзел каля 500 штангістаў з 42 краін. У камандным заліку перамогу святкавалі майстры з Германіі, другімі былі расіяне, трэцімі – шведы. Тут нельга не адзначыць, што Расія была прадстаўлена на чэмпіянаце 38 спартсменамі. Прадстаўнічымі аказаліся і каманды іншых дзяржаў. А вось з Беларусі за ўзнагароды змагаліся ўсяго 3 атлеты – двое з Мінску і адзін гамяльчанін.

Сярод беларускіх спартсменаў лепшага выніку дасягнуў дацэнт кафедры філасофіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта 65-гадовы Аляксей Фяськоў. Ён заваяваў бронзавы медаль і ўстанавіў два асабістыя рэкорды, уступіўшы сярэбранаму прызёру чэмпіянату ўсяго 2,5 кг. Мінчане ў сваіх вагавых катэгорыях заваявалі 4-е месца.

Аляксей Фяськоў ужо неаднаразова выступаў на чэмпіянатах Еўропы, свету і першых Алімпійскіх гульнях ветэранаў. І як правіла, уздымаўся на адну з прыступкаў п'едэстала гонару. З аптымізмам глядзіць ветэран у будучыню. Яшчэ больш паспяхова ён разлічвае выступіць на чарговым першынстве Еўропы, якое адбудзецца ў маі наступнага года і на другіх Алімпійскіх гульнях ветэранаў, што пройдуць у Мельбурне (Аўстралія).

**На здымку: А.Фяськоў з бронзавай узнагародай чэмпіянату свету па цяжкай атлетыцы.**

•

# ВАЛЕЙБАЛІСТЫ І ФУТБАЛІСТЫ – ЧЭМПІЁНЫ

У Мінску прайшлі спаборніцтвы па валейболу сярод мужчынскіх каманд у праграме Спартакіяды ВНУ. 8 фіналістаў былі разбіты на 2 падгрупы.

У падгрупе "А" студэнты ГДУ з аднолькавым лікам 3:0 атрымалі перамогі над камандамі Гродзенскага і Беларускага дзяржуніверсітэтаў, а таксама Беларускага камерцыйнага універсітэта кіравання. Па дзве мацнейшыя каманды з кожнай падгрупы працягнулі спрэчку за ўзнагароды.



У першай сустрэчы нашы валейбалісты з лікам 3:0 узялі верх над студэнтамі Брэсцкага дзяржуніверсітэта, а ў паядынку за першае месца яны зноў сустрэліся з камандай камерцыйнага універсітэта кіравання і зноў святкавалі перамогу з такім жа лікам – 3:0. У выніку заваяваны вышэйшыя ўзнагароды Спартакіяды. У дасягнутым поспеху заслуга як саміх валейбалістаў, так і іх трэнера – старшага выкладчыка кафедры спартыўных дысцыплін У.У.Макарэвіча.

Напрыканцы неабходна адзначыць, што Рэспубліканскі цэнтр фізічнага выхавання і спорту прапанаваў стварыць зборную мужчынскую каманду Беларусі па валейболу для ўдзелу ў сусветных студэнцкіх гульнях 2003 года, якія адбудуцца ў Карэі, на базе нашага універсітэта.

* * *

На мінскім стадыёне "Камвольшчык" прайшлі фінальныя гульні Спартакіяды ВНУ па футболу.



На папярэднім этапе нашы футбалісты перамаглі каманду БДУ – 2:0, а з камандамі Брэсцкага дзяржуніверсітэта і Беларускага педуніверсітэта імя М.Танка згулялі ўнічыю, адпаведна 2:2 і 1:1. У фінале нашы студэнты перамаглі каманды Акадэміі фізічнай культуры і спорту – 2:0 і Магілёўскага дзяржуніверсітэта – 7:0. У выніку выхаванцы старшага выкладчыка У.І.Джыоева сталі чэмпіёнамі рэспублікі.

Заслугоўвае ўвагі і тое, што загадчык кафедры спартыўных дысцыплін дацэнт Б.М.Зайцаў выязджаў на фінальныя гульні праведзеных спаборніцтваў, каб падбадзёрыць нашых ігракоў.

**В.МАРЧАНКА,**
**наш спартыўны аглядальнік.**

# ВЫСТУПІЦЬ НА ЗІМОВАЙ АЛІМПІЯДЗЕ

Усё менш часу застаецца да чарговых зімовых Алімпійскіх гульняў – 2002, якія адбудуцца ў амерыканскім горадзе Солт-Лейк-Сіці. Ганаровае права прадстаўляць на іх Рэспубліку Беларусь заваявала студэнтка завочнага факультэта нашага універсітэта Ала Цупер – адна з мацнейшых спартсменак свету па фрыстайлу.

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
– батанікі і фізіялогіі раслін — асістэнта;
– фізіялогіі чалавека і жывёлін — асістэнта;
– эканамічнай інфарматыкі і АСК — старшага выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў біялагічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці кандыдата ветэрынарных навук, загадчыка кафедры заалогіі і аховы прыроды **МІХАЛУСЁВА Уладзіміра Іванавіча** і выказваюць сваё спачуванне яго родным і блізкім.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: vergeenko@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 636
Падпісана да друку 2.11.2001 г.